**А. Г. Цымбал**

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДАКУМЕНТАХ ПОЛЬСКАГА ПАДПОЛЛЯ (1941–1944)

Нацыянальныя адносіны на тэрыторыі Беларусі ў гады акупацыі (1941–1944) былі вельмі складаныя. Вынікала гэта з гістарычна-культурных прычын, што спрыялі захаванню палітычных абставін і імкненняў беларускага, польскага літоўскага і ўкраінскага бакоў. Польскае падполле, якое дзейнічала на тэрыторыі Заходняй Беларусі з 1939–1940-х гг., імкнулася да рэалізацыі палітыкі эміграцыйнага ўрада ў Лондане, мэтай якой было вяртанне перадваеннага стану, а магчыма, і павелічэннне тэрыторыі на ўсходзе [1, s. 167]. Польскія фарміраванні рэгулярна адсочвалі развіццё міжнацыянальных адносін, аб чым складаліся адпаведныя рапарты. Некаторыя з іх захаваліся ў фондзе Дэлегатуры ўрада і ўтрымліваюць цікавую інфармацыю па праблемах нацыянальных адносін у гады акупацыі на тэрыторыі Беларусі [2, арк. 64–67].

У выніку наступлення германскіх войскаў беларускія землі апынуліся ў акупацыі. Частка з іх была ўключана ў склад Генеральнай акругі «Беларусь». Нямецкія ўлады на занятых тэрыторыях не забаранялі і падтрымлівалі

стыхійнае фарміраванне лакальных улад з удзелам мясцовага польскага насельніцтва. Такім чынам, стваралася ілюзія вяртання сітуацыі да становішча да 1 верасня 1939 г.

Кадры для новаўтворанай адміністрацыі хутка папаўняліся за кошт рэпатрыянтаў, якія пачалі вяртацца ў Беларусь. Першыя месяцы германскай акупацыі вызначаліся асабліва асцярожнымі адносінамі да польскай меншасці. У сваю чаргу, польскае насельніцтва таксама было прыхільным да немцаў. Такія ўзаемаадносіны ў польскіх крыніцах абгрунтоўваюцца тым, што хуткае адступленне бальшавікоў выклікала супакаенне сярод палякаў, хаця на немцаў надалей глядзелі як на ворагаў. Нямецкія ўлады разумелі настроі, якія панавалі сярод мясцовага польскага насельніцтва. У асяроддзі прадстаўнікоў акупацыйных гаспадарчых улад у той час з'явіліся паняцці *вестпол* і *остпол*. Сцвярджалася, што другая группа палякаў больш прыдатна да суіснавання з немцамі і будзе ўспрымацца пазітыўна пры стварэнні «Новай Еўропы». Адзначалася, што адносіны сельскага насельніцтва да акупантаў у пачатку вайны не былі варожымі. Памешчыкі, якія пачалі вяртацца ў свае маёнткі, пры прыхільных адносінах немцаў набылі магчымасць рэстытуцыі ўладанняў. Яны хоць і не атрымалі правоў уласнасці, але неаднаразова выражалі пранямецкія сімпатыі [3, арк. 47].

Вырашальную ролю ў фарміраванні акупацыйнай адміністрацыі адыграла сітуацыя на франтах вайны. Ужо ў верасні і пачатку кастрычніка 1941 г. пачынаецца перыяд афіцыйнай беларусізацыі краю пад нямецкім кіраўніцтвам. Найбольшыя поспехі яна мела на тэрыторыях, дзе дамінавала праваслаўнае насельніцтва, якое яшчэ з часоў II Рэчы Паспалітай характарызавалася варожымі адносінамі да польскай дзяржаўнасці.

Падзел тэрыторыі выглядаў наступным чынам:

1) Слонімшчына, Дзятлаўшчына, Навагрудак, Нясвіж, Баранавічы, Стоўбцы, Вілейка – тэрыторыі з моцным беларускім уплывам;

2) Браслаўшчына, Паставы, Дзісненшчына, ваколіцы Ліды, Івянец і Валожын – рэгіён з найменшым беларускім уплывам.

Згодна з паведамленнямі польскага падполля, немцы на тэрыторыі Беларусі пры дапамозе невялікай групы беларусаў праводзяць у першую чаргу антыпольскую і антысавецкую палітыку. Гэтае кола, якое складаецца з польскіх, пражскіх, берлінскіх і савецкіх беларусаў, кіруе адміністрацыяй, школьніцтвам і культурным жыццём. Яны робяць толькі тое, што кажуць акупанты, але самі немцы не разглядаюць беларускі рух як істотную сілу. Група польскіх беларусаў – ідэалісты і кар'ерысты – змагаліся з русіфікацыяй і нібыта марылі аб уніі Беларусі і Польшчы або ўвогуле ўваходжанні Беларусі ў склад Польшчы. Кар'ерысты думалі толькі пра сябе. Групоўка пражскіх, берлінскіх, а разам з імі частка камуністычна настроеных польскіх беларусаў актыўна змагалася з усім польскім. Савецкія беларусы, якія працавалі ў адміністрацыі, займалі падпарадкаванае становішча і былі пасіўнымі. Адзначалася, што сярод іх было шмат палякаў. Характэрнай асаблівасцю сітуацыі з'яўлялася тое, што асобныя групы і людзі на кіруючых пасадах замагаліся адзін з адным, пісалі даносы. Насельніцтва гэтым беларускім лідарам не давярала і не разумела іх [3, арк. 58].

Цэнтрам беларускага руху сталі камітэты Беларускай народнай самапомачы (БНС). Кадры для яе рэкрутаваліся ў асноўным з былых беларускіх дзеячаў міжваеннай Польшчы, а таксама з асоб рускай нацыянальнасці і праваслаўнага духавенства, якія пачыналі запісвацца ў беларусаў і ўзмацнялі свой уплыў.

У самакіраванні ў правінцыі беларусізацыя пачынаецца з прызначэння на кіруючыя пасады беларусаў, што масава прыбывалі з Вільні, Дынабурга і з эміграцыі і прыцягвалі сваіх людзей на пасады, якія раней займалі палякі. Замяшчэнне пасад часам адбывалася праз канфлікты і абвінавачванні ў варожай дзейнасці, пасля чаго палякаў расстрэльвалі, як гэта было пры заняцці пасады бурмістра ў г. Нясвіж.

Галоўную ролю ў многіх мясцовасцях адыгрывала праваслаўнае духавенства і іх блізкія. Аднак немецкія ўлады занялі пазіцыю «падзяляй і ўладар», падбіваючы беларусаў і палякаў да супрацьстаяння. Становішча з восені 1941 г. да вясны 1942 г. было адносна спакойным. Беларусізацыя адміністрацыйнага апарату і школьніцтва, акрамя фарміравання паліцыі, пачынала развівацца, але адносіны з палякамі яшчэ не былі варожымі. Адбываецца рост уплыву Беларускага камітэта ў Мінску, сведчаннем чаго, паводле дакументаў польскага падполля, былі асобныя арышты памешчыкаў, якія жорстка абыходзіліся з сялянамі, адбіралі маёмасць і інвентар.

Ужо з вясны 1942 г. назіраліся істотныя змены, пачыналі з’яўляцца савецкія партызанскія фарміраванні, што аказала істотны ўплыў на мясцовае насельніцтва. Беларусізацыя акупаваных тэрыторый паглыбілася і пачала набываць выразны антыпольскі характар. Беларускія калабаранты прыкладалі шмат намаганняў да справы вывазу польскага насельніцтва на работы ў Германію. У якасці прыкладу прыводзяцца тры варыянты спіса асоб, прызначаных да вывазу ў Дзісненскім і Пастаўскім паветах, калі кожны новы спіс быў скарэктаваным папярэднім у бок змяншэння колькасці беларусаў і павелічэння кольасці палякаў.

Беларусізацыя як метад кіравання стала акцыяй, якую падтрымлівалі акупацыйныя ўлады. Яны спрабавалі гэта максімальна скарыстаць у сувязі з пагаршэннем сітуацыі на фронце, пашырэннем партызанскага руху, з’яўленнем узброеных фарміраванняў з былых ваеннапалонных, яўрэяў і інш.

У канцы чэрвеня 1942 г. выйшлі распараджэнні В. Кубэ аб уключэнні прадстаўнікоў БНС у Генеральны камісарыят у Мінску, а таксама аб стварэнні корпуса самааховы. Першае распараджэнне мела на мэце арганізацыю інстытута, які б звязваў нямецкія ўлады з БНС і беларускім самакіраваннем. Другое прадугледжвала разгортванне барацьбы з партызанскім рухам і іншымі варожымі сіламі. Па меркаванні польскіх падпольных сіл, гэтыя распараджэнні ў першую чаргу былі накіраваны супраць палякаў.

У Генеральным камісарыяце ў Мінску з’яўляліся прапановы сепарацыі польскага насельніцтва з адпаведнай адзнакай, накшталт яўрэяў. У некаторых мясцовых органах кіравання ўводзілася патрабаванне размаўляць

толькі па-беларуску, а не па-польску, што каралася штрафам у 500 рублёў, і таксама праводзіць пропаведзі і набажэнствы ў каталіцкіх касцёлах на беларускай мове. Тое ж датычылася і навучання ў школах, дзе адбылася поўная беларусізацыя.

Пад патранатам В. Кубэ пачала разгортвацца антыпольская прапаганда ў мінскім і баранавіцкім друку. У сваім атрыкуле ў «Беларускай газеце» ён падкрэсліваў, што ворагамі беларусаў з’яўляюцца партызаны, яўрэі і палякі, якія да гэтага часу не пазбавіліся сваіх мар адносна панавання і ўплыву. Часта ў канфлікце БНС і палякаў пад пакаранні траплялі асобы, якія працавалі на немцаў і да якіх нямецкія ўлады не мелі пытанняў [3, арк. 49].

У той жа час спроба стварэння аддзелаў самаабароны не прынесла чаканых вынікаў. Вярбоўка, якая набывала розныя формы, не прывабіла да іх мясцовае насельніцтва. Яны практычна не ўдзельнічалі ў баях, а да барацьбы з партызанамі былі прыцягнуты ўзмоцненыя аддзелы СС, літоўскія і латышскія добраахвотнікі. Але ўжо ў 1943 г. гэтыя фарміраванні разам з беларускай паліцыяй не маглі кантраляваць сітуацыю, бо іх улада ахоплівала толькі тэрыторыю, дзе яны размяшчаліся, а бліжэйшая ваколіца знаходзілася пад кантролем партызан.

У гэтых умовах арганізацыя жыцця пад нямецкім кантролем сутыкаецца са значнымі перашкодамі. У той жа час мясцовыя органы самакіравання знаходзіліся ў небяспецы ў сувязі з варожымі да іх адносінамі з боку партызан.

Разбурэнне міфа аб непераможнасці нямецкай арміі стварыла перад беларусамі новую перспектыву і прывяло да паступовага паслаблення напружанага супрацьстаяння з палякамі, згортвання супрацоўніцтва з немцамі, пошуку кантактаў з партызанамі. Адначасова адмаўляюцца ад прабеларускай дзейнасці праваслаўныя святары. У польскіх справаздачах адзначалася, што ў самім беларускіх руху пачынаў назірацца разлом і ўзмацненне антаганізму ў дачыненні да «рускасці і праваслаўя» [3, арк. 49]. У выданні «Беларускі голас» ад 22.01.1943 г. з’явіўся артыкул, перадрукаваны з берлінскай «Раніцы», у якім аўтары сцвярджалі, што беларускае грамадства прыняло ў свой склад людзей, якія толькі зараз падчас вайны запісаліся ў беларусы, а да вайны з’яўляліся ворагамі беларускага народа. Датычылася гэта духавенства, якое да 1939 г. было або «ісцінна рускім», або «палякамі праваслаўнага веравызнання», а ў 1943 г. аб’явілі сваю манаполію на беларускасць. Гэтых асоб аўтар прапаноўваў абмежаваць у грамадскім жыцці. Беларускі друк у часы акупацыі пачаў атакаваць праваслаўе, патрабуючы змены календара, і абвінавачваў рэлігію як інструмент падзелу народа і беларусаў на «заходніх» і «ўсходніх». Пры гэтым «усходнікі» ўяўляліся як прасякнутыя расійскай ідэяй.

У час вайны абвастрыліся і беларуска-літоўскія адносіны. У сітуацыйнай справаздачы польскага падполля з усходніх зямель за сакавік 1944 г. паведамлялася, што паміж беларусамі і літоўцамі пачаліся сутыкненні

адносна літоўскага шавінізму і імперыялізму. На практыцы гэта праяўлялася ў палітыцы літвінізацыі беларускіх ваколіц Віленшчыны. Акрамя таго, выразна прасочваліся тэндэнцыі літоўскай экспансіі ў Навагрудчыну і Гродзеншчыну з намерам атрымаць агульную мяжу Літвы з Украінай. Праяўлялі літоўцы інтарэс і да Беластока, які ў літоўскім друку называлі літоўскім горадам. Паводле польскіх дакументаў, да беларусаў літоўцы ставіліся з вялікай пагардай, як да народа, які стаяў ніжэй па ўзроўні самасвядомасці і культуры, акрамя таго, абвінавачвалі беларусаў у тым, што ў адміністрацыйнай практыцы на тэрыторыі Генеральнай акругі «Беларусь» занадта талерантна адносяцца да палякаў [4, арк. 240].

Характэрна, што польскія палітычныя сілы распрацоўвалі свае варыянты нацыянальнай палітыкі і вырашэння ўкраінскага і беларускага пытанняў у Польшчы пасля вайны. Захаваўся чарнавы варыянт дакумента аб максімальнай і рацыянальнай праграме нацыянальнай палітыкі ў двух выпадках: спрыяльнай палітычнай кан’юнктуры і неспрыяльнай. У першым выпадку праграма ўвязвалася адначасова з ажыццяўленнем аграрнай рэформы, якая павінна была адыграць ролю тактычнага сродку да мірнага суіснавання паміж «вялікай і магутнай Польшчай, вялікай Украінай і такой жа Беларуссю» [5, арк. 192–193]. Цікавымі выглядалі метады арганізацыі мірнага суіснавання. Сцвярджалася, што асіміляцыйныя падыходы страцілі сваю актуальнасць і, як паказваў гістарычны вопыт, немагчыма наладзіць жыццё пад агульным дахам. У сувязі з гэтым патрэбнасць свабоднай зямлі для сялян-палякаў прыводзіла распрацоўшчыкаў плана да неабходнасці высялення беларускага насельніцтва далей на ўсход, на тэрыторыі Савецкай Беларусі [5, арк. 192–193].

Агульны падыход польскіх улад адносна беларусаў адлюстраваны ў рашэнні Нацыянальнай рады ад 29 чэрвеня 1944 г. У ім сцвярджалася, што беларускі народ павінен зразумець, што 1) яго беларускія імкненні да незалежнасці не павінны быць накіраваны супраць Польшчы, бо не існуе магчымасці ўзнікнення беларускай дзяржавы без існавання моцнай Польшчы; 2) не будзе моцнай польскай дзяржавы без паўночна-ўсходніх ваяводстваў (Віленскае, Навагрудскае і Палескае); 3) незалежную дзяржаву неабходна будаваць не на нацыянальна змешаных тэрыторыях, а толькі на нацыянальна аднародных [6, арк. 25].

Дакументы польскага падполля прадстаўляюць цікавую гістарычную крыніцу, інфармацыйны матэрыял якой у беларускай гістарыяграфіі практычна не выкарыстаны. Яго аналіз дазваляе значна ўзбагаціць айчынную гістарычную навуку факталагічнымі ведамі наконт спецыфікі нацыянальных адносін у гады нямецкай акупацыі тэрыторыі Беларусі, а таксама раскрыць малавядомыя аспекты гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У той жа час інфармацыя, змешчаная ў дакументах, патрабуе навуковай верыфікацыі і ўдакладнення.

ЛІТАРАТУРА

1. *Mironowicz, E.* Wojna wszystkich ze wszystkimi. Białoruś 1941–1944 / E. Mironowicz. – Kraków: Avalon, 2015. – 243 s.
2. Archiwum Akt Nowych. – Delegatura Rządu na Kraj. – Syg. 202/III/134.
3. Archiwum Akt Nowych. – Delegatura Rządu na Kraj. – Syg. 202/III/203.
4. Archiwum Akt Nowych. – Delegatura Rządu na Kraj. – Syg. 202/III/107.
5. Archiwum Akt Nowych. – Delegatura Rządu na Kraj. – Syg. 202/II/51.
6. Archiwum Akt Nowych. – Delegatura Rządu na Kraj. – Syg. 202/XVI-1.